Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня**, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукована га залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп

№ 13. Вільня, Нядзеля, 8-га лютага 1925 г. Год I.

Кожны беларус, які хоча вучыць сваіх дзетак у беларускай школе, павінен скласьці аб гэтым Інспэктару дэклярацыю (гэта значыць заяву).

„Народ сам сабе!“

Цэнтральным пытаньнем у беларускім жыцьці пад Польшчай зьяўляецца ў гэты мамэнт бясспрэчна пытаньне аб роднай школе.

Есьць дзьве дарогі да вырашэньня гэтага пытаньня: адна—гэта стварэньне дзяржаўнае, ўрадавае беларускае школы, забясьпечанае—праўда, толькі на паперы! — міжнароднымі трактатамі і польскай канстытуцыяй; другая—гэта збудаваньне беларускае прыватнае школы сіламі і коштам не дзяржавы (якая таксама жыве народнымі грашамі), але беларускага народу.

Каб дабіцца першага, патрэбны дзьве рэчы: моцнае, стойкае дамаганьне беларускае школы нашым сялянствам і — добрая воля польскае ўлады.

Мы ўжо падавалі жменю даных аб сялянскіх прыгаворах з дамаганьнем беларускае школы. Да Каляд такіх прыговораў, паводле тых ведамасьцей, якія мы мелі, было ўжо каля сотні. І нічога не прашкаджала ўладзе, калі-б яна запраўды хацела здаволіць народныя дамаганьні, стварыць гэныя школы, бо і будынкі для іх ёсьць, і выкваліфікаваныя настаўнікі-беларусы, атрымаўшыя свае кваліфікацыі на кракаўскіх (—польскіх) і віленскіх (—беларускіх) курсах.

Ніводнага з гэтых дамаганьняў улада не здаволіла. Школьныя інспэктары або нічога на іх не адказвалі, або заяўлялі, што йшчэ няма „выканаўчага распараджэньня“, дык і зрабіць нічога нельга. Калі-ж выйшла гэтае „выканаўчае распараджэньне“, якое ўводзіць сыстэму не грамадзкіх прыговораў, а дэклярацыяў кожнага бацькі асобна,—дык ужо гэныя ранейшыя дамаганьні аказаліся ня маючымі сілы. І цяпер перад намі новая задача: *выявіць народнае жаданьне беларускае школы*—у *новай форме.*

Мы пэўны, што народ выявіць гэтае жаданьне, падаючы масава вымаганыя дэклярацыі. З боку народу будзе зроблена ўсё, што трэба. Але ці з боку ўлады можна спадзявацца таго-ж самага?

Хай аб гэтым гавораць факты.

Перш за ўсё лічба настаўнікаў для беларускіх школаў, якіх падрыхтоўвае ўрад. На курсах у Вільні і ў Кракаве, якія яшчэ толькі *маюць быць адчынены*, будзе вучыцца ўсяго *толькі 80 душ.* Значыць, гэтымі сіламі немагчыма абслужыць нават тую лічбу школ, якіх народ *ужо зажадаў.*

Далей, уся навука на гэтых курсах мае быць ведзена па-польску, апрача аднае толькі беларускае мовы. Гэтак настаўнікі, прайшоўшы гэныя курсы, будуць больш падгатаваны да навучаньня ў *польскіх* школах чым у беларускіх...

Урэшце, як мы даведаліся, курсы ў Вільні маюць быць *васьмімесячныя.* Яны будуць адкрыты толькі пасьля зьезду куратараў, які вызначаны ў лютым месяцы, — значыць, *не раней сакавіка* (марца) с. г., — і закончацца *не раней лістапада.* Такім чынам, выпуск „навытараных“ польскаю ўладаю беларускіх пэдагогаў (наскольні ўсе яны будуць беларусамі, гэта асобнае пытаньне!) *да пачатку 1925-26 школьнага году ня будзе йшчэ гатовы,*—значыць, яны пойдуць „у работу“ мо' толькі... ў восені 1926 году!

Ведама, пры добрай волі з боку ўраду і ў гэту восень можна лёгка пусьціць у рух хоцьбы са дзьве сотні беларускіх школ з тымі сіламі, якія ў свой час скончылі беларускія курсы ў Вільні, „кваліфікаваліся“ ў Кракаве і... вучаць цяпер у польскіх школах на ўсім пracторы Польскага гаспадарства! І тады ня трэба было-б гэных скорасьпелых курсаў, што цяпер ладзяцца ўрадам, а можна было-бы стварыць паважную школу — прэпаранду прынамся з $1^1/_2$ гадовым курсам навукі. Але... да гэтага йшчэ далёка!

Далёка,—а тымчасам патрэба беларускае школы расьце не па дням, а па гадзінам. Тых „казённых“ вучыцялёў і „казённых“ школаў будзе мала: гэта-ж кропля ў моры! І вось нам трэба сваімі сіламі тварыць школу ў роднай мове, трэба йсьці сваім уласным шляхам—шляхам *прыватнае школы.*

„*Народ сам сабе*!“ — гэтыя словы напісалі чэхі на пабудаваным за ўсенародныя складкі ў сталічным месьце Празе вялізарным чэскім тэатры. „*Народ сам сабе*! — так павінны мы напісаць на нашай школе, якую самі мусім збудаваць.

А такая будоўля, пастаўленая *самім народам*, будзе моцная непарушная, і ніякая сіла разваліць яе ня здолее!

Польска-гданскі канфлікт.

Рэзалюцыя Высокага Камісара Лігі.

Высокі Камісар Лігі ў Гданску нарэшце выдаў доўга чаканую рэзалюцыю — якраз такую, якой можна было і спадзявацца. Рэзалюцыя кажа, што Польшча, паводле істнуючых умоваў і папярэдніх разьясьненьняў Высокіх Камісараў, мае права мець паштовую ўстанову ў Гданску **толькі для карэспандэнцыі сваіх урадавых установаў і ня мае права ні на якія паштовыя ўстановы і апэрацыі па-за Цэнтральным Гмахам Пошты на пляцу Габэліуса.**

Гэтым самым Камісар сьцьвярджае, што паштовыя скрынкі, павешаныя па ўсім месьце і для карыстаньня публікі — побач з скрынкамі дзяржаўнай пошты Гданска, дый уся гэтая канкурэнцыя з апошняй, — зьяўляюцца **незаконнымі.**

Як ведама, Польшча ўжо перанесла спор ў Лігу Народаў, дык рэзалюцыя Камісара да аканчальнага вырашэньня справы Лігай ня можа быць выпаўнена.

Але — ці-ж можна сумлявацца, што, калі цяпер, пасьля ўсіх візытаў віцэ-сэкрэтара і іншых аўтарытэтных урадоўцаў сэкрэтарыяту Лігі, пасьля абшырнай перапісі, **пасьля ня прыняцьця** ў Англіі адстаўкі гэтага камісара Мак-Донэля, нарэшце — пасьля спэцыяльнай прапазіцыі яму-ж выдаць сваю рэзалюцыю, без якой Рада Лігі ня будзе вырашаць аканчальна справы, — ці-ж можна сумлявацца, што пасьля ўсяго гэтага вышэйшыя інстанцыі Лігі зацьвердзяць рэзалюцыю свайго Камісара, якога змусілі аставацца на яго становішчы?

Заява Гданскага Сэнату.

У сувязі з апублікаванай рэзалюцыяй Высокага Камісара, якая забараняе польскай пошце мець свае скрынкі і наагул усялякую дзейнасьць у месьце, апрача аднаго толькі гмаху Цэнтральнага Паштовага Ураду,—Гданскі Сэнат апублікаваў гэткую заяву:

„З прычыны таго, што польскі ўрад фактычна ўвёў паштовую службу ў Гданску паміма разьемчага суда ў гэтай спрэчнай справе, Урад Вольнага Места Гданску трэбуе павароту да таго стану рэчаў, які быў да гэтага самавольнага акту польскага ўраду,—гэта значыць: безадкладнага зьняцьця польскіх скрынак і іншых паштовых установаў па-за гмахам Цэнтральнага Паштовага Ураду.

Выясьненьне распараджэньня Міністра Рэлігійных Вызнаньняў і Публічнай Асьветы

ад 7. I. 1925 г. ў справе ўставу аб арганізацыі беларускага школьніцтва ад 31. VII. 1924 году.

(Да артыкулаў 3 і 4 ўставу).

§ 1. Беларускія ўрадовыя школы могуць адчыняцца ў Віленскім, Навагрудзкім, Палескім ваяводзтвах, у Горадзенскім і Ваўкавыскім паветах Беластоцкага ваяводзтва.

§ 2. Народная школа ёсьць даступна для дзяцей усіх нацыянальнасьцяў. Кожная вёска ці хутар належыць да пэўнага школьнага вокругу (абводу). У кожным такім школьным вокрузе павінна быць адна публічная ўрадовая школа.

§ 3. „Publiczne szkoły powszechne“—гэта значыць дзяржаўныя, у якія могуць паступаць дзеці ўсіх нацыянальнасцяў дадзенага школьнага вокругу.

§ 4. У ваяводзтвах Віленскім, Навагрудзкім, Палескім, а таксама Горадзенскім і Ваўкавыскім паветах, Беластоцкага ваяводзтва могуць быць школы беларускія, або польскія, або польска-беларускія.

§ 5. Права на жаданьне бацькоў вымагаць навучаньня сваіх дзяцей у роднай беларускай мове маюць жыхары тэй гміны, у якой, згодна апошней перапісі ў 1921 г., ёсьць ня менш як 25% беларусаў сярод агульнага ліку насельнікаў.

§ 6. Публічная народная школа павінна быць адчынена там, дзе вызначыць дэкрэт аб арганізацыі школы.

§ 7.-b. Школьны век дзіцяці лічыцца ад 1 верасьня (сентября) таго каляндарнага году, у якім дзіця скончыла ці мае скончыць 7 гадоў і да канца таго школьнага году (30 чэрвеня), у якім дзіця канчае 14 гадоў жыцьця, гэта значыць ад 7 год без 4 месяцаў да 14 гадоў і 4 месяцаў.

§ 8. Права выступаць з жаданьнем навучаньня сваіх дзяцей школьнага веку маюць: 1) бацька; 2) матка, калі бацька памёр ці не выпаў-

 няе бацькаўскай улады; калі няма бацькі і маткі, то праўны апякун.

Аб жаданьні навучаньня дзяцей у беларускай мове бацькі ці апякуны падаюць дэклярацыі Школьнаму Інспэктару свайго павету.

На дэклярацыі ўласнаручны подпіс павінен быць заверааны гмінаю, ці міравым судзьдзёю, ці натарыусам, ці старэствам.

УВАГА: Калі бацька ці матка, ці апякун нялісьменны, то за яго падпісываецца хто іншы, і сьцьвярджаецца ўжо гэты подпіс.

Калі Школьнаму Інспэктару бацькі з якога-колечы школьнага вокругу пададуць дэклярацый ня менш як на 40 дзяцей аб тым, што хочуць вучыць сваіх дзяцей у беларускай мове, то Інспэктар наводзіць спраўкі:

1, ці ёсьць у гміне 25% (дваццаць пяць процантаў) беларусаў,

2, ці бацька, або матка, або апякун жывуць з дзяцьмі ў дадзеным школьным вокрузе.

3, ці дзеці, на якія пададзены дэкляцыі, жывы і ці адпавядае іх век школьнаму.

4, ці апякун ёсьць праўны.

§ 9. Выкладовая мова з польскай на беларускую можа быць заменена толькі ў пачатку школьнага году.

Дэкляацыі можна падаваць Інспэктару ў працягу ўсяго школьнага году, але будуць мець сілу на наступны школьны год толькі тыя, якія будуць складзены да 31 сьнежня (декабря) папярэдняга школьнага году.

§ 10. Аб тым, што бацькі ня менш як на 40 дзяцей падалі дэкляцыі, каб іх дзяцей вучылі ў беларускай мове, Школьны Інспэктар да 1 лютага (февраля) паведамляе аб гэтым люднасьць таго школьнага вокругу, ці ня будзе рэшта бацькоў прасіць Інспэктара, каб іх дзяцей вучылі ў польскай мове.

Аб гэтым абвестка Інспэктара вывешваецца ў гміне або ў вёсцы на відным мейсцы, толькі не на школьным будынку.

Дэкляацыі аб жаданьні навучаньня дзяцей у польскай мове будуць мець сілу толькі тыя, якія будуць пададзены Інспэктару да 30 красавіка (апрэля).

§ 11. Калі адна ці некалькі вёсак не ўваходзяць у той ці іншы школьны вокруг, то можа быць часова і прыблізна вызначаны школьны вокруг.

§ 12. Разгледзіўшы дэкляацыі, Школьны Інспэктар не пазьней 31 траўня (мая) робіць свае заключэньне і з усімі матар'яламі справу перадае Куратару. На падставе дадзеных Інспэктарам прапазіцый, Куратар у працягу месяца рашае аб мове навучаньня ў тэй ці іншай школе і аб сваім рашэньні праз абвестку паведамляе заінтарасаваную люднасьць. Апроч таго, аб сваім рашэньні куратар паведамляе аднаго з тых бацькоў, якія жадаюць навучаньня сваіх дзязей у беларускай мове і аднаго з тых, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у польскай мове.

Пастанову Куратара бацькі могуць абжалаваць да Міністра Асьветы у працягу 14 дзен, з дня паведамленьня праз абвестку.

§ 13. Істнуючыя ў даны момант народныя школы з выкладоваю мовай беларускаю або польскаю захоўваюць гэту мову й далей.

Зьмена выкладовай мовы ў гэтых школах можа здзейсьніцца толькі па жаданьню бацькоў згодна §§ 8, 9, 10, 11 і 12.

Калі-ж бацькі ад 20 вучняў пажадаюць, каб у беларускай школе навукі выкладаліся папольску, а рэшта дзяцей будзе ня меньш як 40, то зараз жа школа робіцца дзьвех моўнаю г. з польска-беларускаю; а калі з рэшты дзяцей не набярэцца 40, то выкладовая мова ў гэтай школе будзе польская.

§ 14. Істнуючыя ў даны момант беларускія публічныя школы, якія не адпавядаюць уставе і § 4 гэтага распараджэньня праз Куратарыюм і Міністра Асьветы паступова будуць да гэтай уставы і распараджэня датасаваны.

§ 15. Аб злучэньні аддзельных публічных школ з выкладоваю моваю толькі беларускаю пастанаўляе куратар.

§ 16. Праграмы усіх прадметоў публічных школаў дзьвёх моўных, а так сама праграмы польскай мовы і гісторыі Польшчы для чыста беларускіх школаў будуць вызначаны асобным распараджэньнем.

§ 17. Як выключэньне толькі для гэтага 1924-1925 школьнага году, тэрмін для складаньня дэкляацыяў 31 сьнежня пераносіцца **на 31 сакавіка (марца) гэтага году.**

Рэшта §§ адносіцца да сярэдніх школаў і вучыцельскіх сэмінарыяў.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада
Вільня, Віленская 12—6.

Формы дэкляацый і інструкцыі можна атрымаць: 1) у Цэнтральнай Беларускай Школьнай Радзе;

2) у Наваградзкім Таварыстве Беларускай Школы;

3) у Радашкоўскім Таварыстве Беларускай Школы;

4) у Беларускім Пасольскім Клюбе ў Варшаве

5) у Сэкрэтарыятах Беларускага Пасольскага. Клюбу.

Клапоты Францыі.

(Ад нашага парыжскага карэспандэнта).

У цэнтры ўвагі францускага палітычнага жыцьця стаіць цэлы рад спраў першараднай вагі для краю, але ўсе гэтыя справы нешта ніяк не даходзяць да вырашэньня.

Францыя вельмі-б хацела дайсьці да паразуменьня з Расеяй. Але з бальшавікамі яна ніяк ня можа дагаварыцца. Ані апошняя канфэрэнцыя самога Эрыо з Красіным, ані нарады новага пасла Эрбэта з маскоўскім урадам ня могуць нават скрануць з месца галоўную перашкоду: справу царскіх даўгоў.

Францыя вымагае ад ССРР аплаты ўсіх даўгоў у суме 11 міліярдаў рублёў у золаце, да таго яшчэ налічыла 7 з паловай міліярдаў за канфіскаваную бальшавікамі маемасьць францускіх грамадзян у Расеі. Але апошняя прамова старшыні Рыкава дала на ўсе гэтыя дамаганьні кароткі і выразны адказ: народы ССРР плаціць даўгоў панаваўшых над імі ворагаў зусім ня зьбіраюцца.

Эрыо пратэставаў проці гэтага адказу, але ў канцы закончыў гарачым жаданьнем дайсьці да згоды і жыць з расейскім народам **у прыязьні, як гэта было перад вайной...**

У другой прамове—у сваім экспозэ, як міністра заграцічных спраў, аб агульнай палітыцы Францыі,—Эрыо гаварыў аб справе даўгоў ужо неяк у іншай форме: што Францыя імкнецца да **практычнага вырашэньня** справы расейскіх даўгоў.

Другая палючая справа францускага жыцьця—справа ўласных ваенных даўгоў Амэрыцы і Англіі.

Чытачы беларускай газэты ведаюць, што Францыя ня толькі ня плоце дагэтуль ані капіталу, ані працэнтаў за гэтыя даўгі сваім крэдытарам, але, як сама ня раз заяўляла, і ня мае ані магчымасьці, ані ахвоты плаціць што-колечы.

Сколькі разоў Францыя выслухоўвала за гэта жорсткія і абразлівыя для дзяржаўнасьці яе закіды і выгавары ад англійскіх і амэрыканскіх дзяржаўнікаў! Але, пасьля рашучай пагрозы Амэрыкі фінансавым байкотам, францускі ўрад заявіў, што плаціць будзе, толькі просіць даць час апрацаваць добры плян і—адкласьці пачатак сплаты.

Справа перайшла ў парлямант. У парляманце ізноў рад паслоў даводзіў, што Францыі павінны яе багатыя і мала пацярпеўшыя ад вайны саюзьнікі дараваць яе даўгі. Вайна каштавала Францыі 120 міліярдаў франкаў, дый 200 мільёнаў яна ўжо ўлажыла ў адбудову зьнішчаных вайной абшараў. Так казаў—пры вопляскаx усяго парляманту пасол Люі Марина.

Але гэтая, спадабаўшаяся Французам прамова зусім не спадабалася амэрыканцам. Францускаму Сойму даў вельмі рэзкі і трафны адказ амэрыканскі Сэнат. Вядомы сэнатар Бора, маючы цяпер вялікі ўплыў на ўрад прэзыдэнта Куліджа, заявіў, што перад усім Францыя павінна наагул адкінуць зусім думку аб тым, што Амэрыка „даруе“ ёй пазычаныя грошы, бо ўзятае трэба аддаць. Гэта—звычай чэсных людзей. Але, апрача таго, Францыя зусім дарэмна ўдае ўбогую і пералічывае толькі тое, што яна **страціла** ў вайне, ня кажучы зусім аб тым, што яна здабыла ў выніку вайны—шляхам прадыктаванага ею міру... Так, напрыклад, яна маўчыць аб тым, што за гэтыя **пазычаныя грошы** на вайну, без якіх ня было-б гэтага **францускага** міру, яна **атрымала ад Нямеччыны і Турцыі аж $4\frac{1}{2}$ мільёны квадр. міль зямлі** (ў тым Эльзас, Лётарынгію і абшар Саары) з 4 мільёнамі душ насяленьня—пад той час, калі нават Англія атрымала на падставе міравога трактату толькі $1\frac{1}{2}$ мільёны міль з $3\frac{1}{2}$ мільёнамі насяленьня! А да таго яшчэ Францыя атрымала ад Нямеччыны

Нядоля эмігрантаў у Францыі.

Польскія газэты паведамляюць, што францускі ўрад арганізуе новы набор нашых работнікаў—на работы ў Францыі. Вербаваць работнікаў на выезд—пры сучасным нячуваным крызісе ў гаспадарчым жыцьці Польшчы—вельмі лёгка. Але іменна гэтай патрэбай нашага працоўнага народу шукаць заробку на чужыне ганебна надужываюць францускія капіталісты.

Вось жменя даных аб варунках працы нашых работнікаў у францускіх капальнях. Даныя гэтыя бяром з польскае газэты „Wychodźca“.

У дэпартаманце „Maine et Loire“ плоцяць за дзень працы пад зямлёй ад $13\frac{1}{2}$ да 21 франка франц., што роўна $3\frac{1}{2}$ да $5\frac{1}{2}$ злотых.

Холад, вільгаць і бруд пануюць у работніцкіх кватэрах. За кожную драбніцу капальня адлічае ад заробку.

Кожнаму работніку даюць коўдру ваўняную, але звычайна дзіравую, ды старую — па ваеннапалонных, і за гэта вылічаюць з пэнсіі на 22 франкі, пад той час, як новая коўдра каштуе ад 14 да 16 фр. Добры заробак?

Для нашага „быдла“ францускія капіталісты лічаць лішнім мыцца. Умывальнікаў у дамох няма, вады—таксама, за вадой трэба хадзіць да чану, дзе плавае гнілое лісьце, чэрві, ды нават здохлыя птушкі.

Апалу і сьвятла работнікам-эмігрантам не даюць: дровы, якіх у капальні шмат валяецца, даюць толькі французам.

Калі работнік захварэе і астаецца дома, дык за час хваробы яму даюць па 5 фр. ($1\frac{1}{2}$ злот.) у дзень, а калі паложаць у бальніцу, дык аплачываюць за яго лячэньне, але сям'і нічога не даюць.

„Як бачым,—піша з гэтае прычыны „Walka Ludu“, перадрукаваўшы даныя з „Wychodźcy, — у такіх варунках выезд у Францыю — гэта зусім кепскі інтэрас, але што рабіць рабочаму і селяніну, каторы ў родным краю знайсьці работы ня можа, а паміраць з голаду ня хоча? Мусіць ехаць... А ці ня лепей было-бы ў краю завясьці такі лад, каб ня трэба было шукаць работы па ўсім сьвеце?“

Інтэрпэляцыі Беларускага Пасольскага Клюбу.

№ 159—да п. Міністра Скарбу — у справе цераамернага абцяжэньня падаткамі жыхароў грамады Дубіч-Мураванскае і Тафілаўскае, Арлянскае гміны, Бельскага пав.

1. Сказаная вёска да сусьветнае вайны мела 60 гаспадарак. З прычыны ваенных падзеяў $^{2}/_{3}$ будынкаў зьнішчаны да—тла, і хоць асталася траціна будынкаў, дык яны вельмі зруйнаваны (без вакон і дзьвярэй). Частковую дапамогу будаўлянымі матэрыяламі дасталі толькі 10 асоб, а рэшта, ня гледзячы на ўсільныя стараньні і матэрыяльныя страты, дагэтуль ніякае дзяржаўнае дапамогі на адбудову не атрымала.

2. Вёска мае 90 каней (разам з жарабятамі), некаторыя сяляне ня маюць яшчэ ніводнага каня. Скаціны ёсьць 100 галоў, з якіх 20 пазычаны да трэцяга цяляці. Да вайны вёска мела 150 каней, рагатае скаціны 300 галоў.

3. Зямлі ёсьць 450 дзесяцін, з якіх 75 дз. пад зарасьняком, 100 не абсеяны з прычыны нястачы інвэнтара і грошы, ды толькі 275 дзес. выраблены. З прычыны нястачы накладаў, зямля родзіць блага. Апошні год быў вялікі неўраджай, хлеба ня хваце нават для сябе, жывы інвэнтар таксама будзе пазбаўлены корму.

Ня гледзячы на гэта, падаткі на 1924 год дасягаюць гэткае сумы:

1. Падатак грунтовы 330,80 зл. 2. Падатак грунтовы, звышка 100% 165,40 зл. 3. Падатак гмінны грунтовы 693,20 зл. 4. Падатак з дамовае жывёлы 319,20 зл. 5. Падатак дарожны 338,58 зл. 6. Страхоўка 268,60 зл. разам 2215,58 зл.

Калі йдзе аб гмінны грунтовы падатак, дык Гмінная рада пастанавіла ўзяць толькі 180 зл., а павятовы соймік самавольна павялічыў да 693,40 зл. Падаткі з жывёлы—бязмэтныя, бо спыняюць натуральны прырост неабходнага інвэнтара; пададак дарожны—несправядлівы, бо сяляне на гэтую мэту адбываюць у дастатачнай меры натуральныя павіннасьці. Дзяржаўныя грунтовыя падаткі — лішне вялікія і перавышаюць ровень даходаў, чарпаных з зямлі.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. Міністра: 1) ці будзе ўрэшце дадзена помач насяленьню Арлянскае гміны на адбудову зьнішчаных вайной гаспадарак? 2) ці маніцца ён зьменшыць падаткі жыхарам Арлянскае гміны?

Варшава, 20 студзеня 1925 году.

№ 160—да п. Міністра Скарбу ў справе **цераамернага ападаткаваньня** насяленьня в. Крывяцічы, Арлянскай гм., Бельскага павету.

Да сусьветнай вайны вёска Крывяцічы налічывала 64 гаспадаркі, якія былі зусім зьнішчаны ў часе ваенных падзей. Ня гледзячы на тое, што мінула ўжо некалькі гадоў ад канца вайны, вёска гэтая яшчэ не адбудавалася, з прычыны адмовы з боку дзяржавы ў разумнай і мэтнай матар'яльнай дапамозе.

Апрача адсутнасьці будынкаў, вёска ня мае, сколькі трэба, жывога інвэнтара. Цяпер вёска мае ўсяго 59 штук каней (разам з жарабятамі); каля чверці гаспадароў ня мае зусім цяглай сілы. Рагатай скаціны ёсьць 61 штука, з якіх 15 — ня ўласныя гаспадароў вёскі Крывяцічы.

Усяго зямлі вёска мае 780 дзесяцін, з якіх 220 дзесяцін — дзірваноў, няўжыткаў (толькі пад пашу); 330 дзесяцін ляжаць папарам дзеля недахвату інвэнтара і абаротных грошаў, і толькі 230 дзес. зямлі абрабляюцца пад сяўбу. Нястача інвэнтара і ўдабрэньняў не дае выцягнуць з гэтай зямлі добрых ураджаяў. Лета 1924 г. прынесла вялікі неўраджай і пазбавіла сялян магчымасьці пракарміцца да канца году ўласным хлебам.

Ня гледзячы на ўсё гэта, сяляне вёскі Крывяцічы абложаны наступнымі падаткамі: 1) Маёнткавы падатак—3094,88 зл., 2) Зямельны 1336—зл., 3) 100 проц. зямельн пад. 668—зл., 4) Гмінны 733,04 зл., 5) Падатак на бальніцы — 261,90 зл., 6) Ад памешканьняў—89 зл., 7) Ад скаціны — 246,15 зл., 8) Дарожны—158,50 зл., 9) Страхоўка — 421,38 зл., разам 7026,85 злотых.

Гэта-ж выпадае каля 30 злотых на 1 дзесяціну орнай зямлі. Каб заплаціць гэтыя падаткі, вёска павінна была-б прадаць усю сваю скаціну!..

Дзеля вышэйпаданага інтэрпэлянты пытаюцца ў п. Міністра: 1) ці мае ён зьменшыць разьмер зямельнага падатку? 2) ці мае ён зьменшыць узносы (раты маёнткавага падатку? і г. д.

Варшава, 20 студзеня 1925 г.

гатоўкай ужо 6 з паловай мільярдаў даляраў, — ня лічучы тавараў і паставак... А Амэрыка за ўсё тое, што зрабіла для вайны ў Эўропе, — не дастала роўным лікам нічога, калі ня лічыць—новых падаткаў, каб плаціць за даўгі Францыі сваім грамадзянам!

Трэцяя, ня менш важная справа, захапіўшая Францыю, гэта—справа адносінаў з Нямеччынай, якія зусім выразна пераходзяць ужо з фазы панаваньня над Нямеччынай у новую фазу — змаганьня... Але аб гэтым—наступным разам.

Парыж. **Кандратовіч.**

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Напады на „Крэсах“.

„Robotnik“ паведамляе: У ноч на 28 студня двое невядомых людзей зрабілі справу нападу на дом сьвяшчэньніка у Марыніне, Астрогскага пав. Напад адбіты. Пагоня пагранічнікаў напала на сьлед бандытаў.

Вечарам 28 студня каля в. Ляскаўцы банда ў лічбе больш дзесяцёх людзей прабавала перайсьці граніцу. Патруль пагранічнікаў перашкодзіў гэтаму. Узьнялася перастрэлка, у выніку якой банда адыйшла назад.

Новы Валынскі ваявода.

На месца ген. Ольшэвскага валынскім ваяводай мае быць назначаны староста Дэмбскі.

Заграніцай.

Новая Канфэрэнцыя аб разбраеньні.

Амэрыканскі кангрэс прыняў прапазіцыю — склікаць новую канфэрэнцыю аб абмяжаваньні збраеньняў. Пачын гэтай прапазіцыі зрабіў Сэнат яшчэ 2 студзеня.

„Разбраеньне сьвету“.

Ліга Народаў апублікавала гэткія лічбы збраеньняў на ўсім сьвеце к канцу 1924 г.

5 з паловай мільёнаў людзей адарваны ад карыснай працы і „гуляюць“ пад аружжам, гатуючыся да забойстваў. Апрача таго ёсьць паўмільёна матросаў.

На моры наагул існуе: вялікіх і меншых браняносцаў—84, крэйсэраў—167 контр-мінаносцаў — 1.000, падводных лодак—400, паветраных караблёў—4.000.

Адчот Лігі сцьвярджае, што агульная лінія ідзе не да паменшаньня, але да павялічэньня гэтых збраеньняў!

Вось табе і ўсе Вашынгтонскія і іншыя Канфэрэнцыі па разбраеньню!

Недарма-ж апошняя так скандальна правалілася ў Рыме!

Дык—ці-ж можа быць што больш забойчага для Вэрсальскай Эўропы!?

Так было перад вайной,—і гэта-ж само сабой давяло да вайны. Таксама, калі ня горш яшчэ ёсьць і цяпер—пасьля „апошняй“ вайны і „найсправядлівейшага міру.

Дык ці-ж можа хто сумлявацца, што новая вайна прыдзе таксама „неспадзявана“, як і ў 1914 г.

Збраеньне Англіі на моры.

Англійскія газэты пішуць, што англійскі ўрад мае будаваць яшчэ 3 новыя крэйсэры, пасьля чаго Англія будзе мець аж на 8 новых ваенных караблеў больш. На гэта ўжо асыгнавана 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (фунт каля 10 руб. золатам).

Грэцка-турэцкі канфлікт.

Грэцка-турэцкі канфлікт, з прычыны высылкі патрыярха з Канстантынопаля, ня толькі не зьліквідаваны, ня толькі ня йдзе да вырашэньня, але яшчэ расьце, ня гледзячы на быццам шчырае (?) пасрэдніцтва вялікіх дзяржаў.

Турэцкі ўрад ня толькі ня просіць ніякога выбачэньня ці пардону, але адмаўляецца перадаць справу канфлікту ў Гаагу і заяўляе афіцыяльна, што, высяліўшы свайго мусульманскага Каліфа (папу), высяліў зусім сьвядома і хрысьціянскага патрыярха, але на тым яшчэ ня спыніцца: ён станоўча пастанавіў высяліць з Турцыі яшчэ і ўсіх 50 грэцкіх япіскапаў.

Бо-ж на шляху вызваленьня краю ад усялякіх чужацкіх уплываў турэцкі ўрад ня спыніцца ні перад якімі мерамі...

Яшчэ больш трывогі выклікае адказ на ваенныя пагрозы грэцкага ўраду Фэтті Бэя ў Ангорскім парляманцэ. Фэтті-Бэй, згадзіўшыся, што высылка патрыярха — факт вельмі сумны, аднак жа заявіў, што гэта—унутраная справа Турцыі, і ўсялякая вайсковая спроба ўмяшацца ў яе выклікала-б з боку нават вельмі мірна настроенай Турцыі аружны адпор...

Новыя рэваляцыі аб Мусоліні.

Газэта „Popolo d‘ Italia“ (Італьянскі Народ) зьмясьціла на першым аркушы буйнымі літарамі гэткую вестку:

„У апошнія часы ідуць чуткі, што прэм‘ер Мусоліні быў 20 гадоў назад у Швайцарыі засуджаны за... звычайнае ўгалоўнае праступленьне.

„Мы гэтым заклікаем п. сэнатара Альбэртіні, рэдактара „Corriere della Sera“, які казаў, што мае тэкст гэтага прысуду, каб ён безадкладна апублікаваў гэты дакумэнт у сваей газэце, ці прачытаў у сэнаце.

Вось правадыр, дык правадыр! — Усё-ж ткі нават у нашы здэмаралізаваныя часы неяк нялоўка, каб на чале ўраду культурнай дзяржавы стаяў—арганізатар „палітычных“ забойстваў, прогрэсыўны паралітык з хворым ужо мозгам, дый яшчэ і звычайны злодзей, ці, можа, што яшчэ горшае...

Калі ж ужо нарэшце канец!?

Зьезд лібэральнай партыі ў Англіі.

У Лёндане 29 студзеня пачаўся агульны зьезд англійскай лібэральнай партыі, якая на апошніх выбарах панясла такое паражэньне, што амаль ня зыйшла зусім з палітычнай арэны.

Зьезд мае на мэце — ажывіць і адрадзіць партыю, выпрацаваць новы статут, новую арганізацыю і гэтак далей. У зьезьдзе прымае ўчасьце каля 2,000 дэлегатаў.

Паяўленьне Асквіта, які нядаўна атрымаў ад караля тытул графа Оксефордзкага, выклікала буру воплескаў.

Выкрыцьце забойцаў ягіпецкага губэрнатара.

З Каіру паведамляюць, што забойцы англійскага Камісара ў Ягіпце знаходзяцца ўжо ў руках паліцыі.

50-лецьце істнаваньня трэцяй францускай рэспублікі (1875—1925 г.).

Пасьля цэлага раду пераваротаў і зьменаў манархіі на рэспубліку і наадварот,—пасьля паражэньня галоўнай арміі францускага імпэратара Напалеона III пад Сэданам, была 4-га верасьня 1870 г.—як пратэст проці няздарнай манархіі—абвешчана ў Францыі такзваная трэцяя (бо-ж трэці раз, лічучы ад Вялікай Рэвалюцыі) Рэспубліка. Але толькі яшчэ цераз 4 з паловай годы, а іменна 30 студня 1875 г., пасьля доўгай барацьбы паміж вельмі моцнымі ў парляманце манархістамі і вельмі слабымі рэспубліканцамі,—была нарэшце ў форме замаскаванага кампрамісу большасьцю аднаго толькі голасу (бо 353 галасамі проці 352!) прынята прапазіцыя „айца Рэспублікі“, нейкага пасла Валёна, устанавіўшага выбар прэзыдэнта на 7 першых гадоў — з магчымасьцяй далейшага выбару яго-ж без перагляду канстытуцыі.

Гэткім чынам была ўведзена ў Францыі рэспубліканская форма дзяржавы—пад націскам палітычнага інстынкту народу. Справе многа памагло і тое, што моцная манархічная большасьць падзялілася паміж некалькімі (аж 3-ма!) прэтэндэнтамі на пасад караля, з якіх наймацнейшы—сябра старэйшай бурбонскай дынастыі — варункам сваей згоды на заняцьце францускага трону ставіў нават скасаваньне ўсялякіх канстытуцыяў і парлямантаў і—„адбудову абсалютнай манархіі“—самадзяржавія!..

Іоффэ — паслом у Токіо.

Венскія газэты даведаліся, што пасол ССРР у Вене, Іоффэ, мае быць назначаны паслом у Токіо (Японія).

Сэнатар Бора аб даўгох.

Сэнатар Бора афіцыяльна запытаўся ў міністра фінансаў ці ён напамінее Італіі, каб тая пачала плаціць свае даўгі Амэрыцы, якіх мае аж 2 мільярды даляраў?..

Ізноў крызіс у Прусіі.

Толькі што выбраны нанова прэм‘ерам сац.-дэм. Браўн падаў прэзыдэнту заяву, што не здалеў стварыць ураду і—адмаўляецца ад выбару.

Прычына—адмова людоўцаў ісьці ў габінэт Браўна.

У Малдаўскай Народнай Рэспубліцы.

Газэты даносяць, што ў новастворанай на граніцы Бэсарабіі Малдаўскай Народнай Рэспубліцы ўзьнялося вялікае ажыўленьне і абурэньне. Першае, з прычыны зробленага ўрадам ССРР паразуменьня з Японіяй, якая заявіла, што не прызнае далучэньня Бэсарабіі да Румыніі. Абурэньне-ж, з прычыны новых гвалтаў румынскай улады над насяленьнем адарванага ад Саюзу краю.

Як ведама, бальшавікі, згодна нацыянальным прынцыпам, адступаюць з Бэсарабіі 2 пераважна румынскія паветы—Ізмаільскі і Кагульскі,—але на рэшце абшару трэбуюць плебісцыту, — гэта знача, каб сам народ выказаўся ў вольным галасаваньні, куды ён хоча: да Румыніі, ці да ССРР.

Румынія, ведаючы добра аб настроі і жаданьні насяленьня, не згаджаецца на гэта і, чуючы небясьпеку, усё рыхтуецца да „абароннай вайны“. У справе гэтай „абароны“ румынскі прэм‘ер езьдзіў у Лёндан, просячы грошаў. Адказ быў дадзены Англіяй... праз Лігу Народаў, сэкрэтар якой у ноце папярэдзіў Румынскі ўрад, каб ён спыніў павялічэньне ваенных бюджэтаў.

І вось, цяпер па ўсей Малдаўскай Рэспубліцы пачаліся варожыя да Румыніі дэманстрацыі. Нованазначаны на месца Троцкага камандзір арміі Фрунзэ, родам з Бэсарабіі, прыбыў у Малдавію і сказаў вельмі выразную прамову аб будучым лёсе Бэсарабіі, якая павінна стацца вольнай Вялікай Малдаўскай Рэспублікай — сябрам вялікага ССРР. А яшчэ-ж толькі-што пасол радавага ўраду ў Вене, Іоффе, выслаў афіцыяльную тэлеграму тымчасоваму ўраду Малдаўскай Рэспублікі ў яе тымчасовай сталіцы Тэрэсполю, заклікаючы яго да будаваньня Вялікай Малдавіі, ня спыняючыся на межах, якія праведзены румынскім захватам.

З усяго відаць, што ў гэтым мейсцы Вэрсальскай Эўропы тэмпэратура паднялася ўжо, можа, да 38 з дзесятымі.

Паўнамоцнікі, якія падавалі Школьнаму Інспэктару прыгавары на адчыненьне беларускай школы, так сама павінны яшчэ падаць дэклярацыі ад кожнага бацькі, бо гэтага вымагае распараджэньне Міністра Асьветы ад 7 I. 1925 г.

ХРОНІКА.

Беларуская мова ў польскіх сэмінарыях. „Dz. Wil.“ паведамляе: па загаду Міністэрства Асьветы віленскі куратар выдаў загад увясьці ў абедзьве віленскія польскія вучыцельскія сэмінарыі навуку беларускае мовы, каб прыгатаваць кадры вучыцялёў для мяшаных школаў (польска-беларускіх) у нашым краю. „У сэмінарыі ў Сьвянцянах тое-ж зроблена для літоўскай мовы. Выклады будуць на IV курсе па 2 гадзіны ў тыдзень, на V курсе—па 4“.

Вось, што будзе ў нас замест вучыцялёў беларусаў.

„Увядзеньне ў жыцьцё языковых законаў“. Пад гэткім гучным загалоўкам варшаўскі карэспандэнт „Dz. Wil.“ піша:

„Падгатаваўчая праца да правядзеньня ў жыцьцё языковых законаў у адносінах да беларускага насяленьня ў усходніх ваяводзтвах закончана.

„Урад заняўся ўрэгуляваньнем гэтай справы такжа і адносна да украінцаў.

„Міністар Тугутт адбыў учара канфэрэнцыю з прафэсарам Цольлем, п. Левэнгэрцам і Сэдакам“(?)

Жадаем, хаця бяз усякай веры, украінцам ўсёж-ткі лепшага „powodzenia“ ў правядзеньні ў жыцьцё гэтых усё яшчэ, відаць, ня жывых законаў,—чым гэта зроблена для беларусаў...

Усё-ж для „падгатаваўчай працы для украінцаў запрашаюць як ні як, але слаўнага прафэсара-юрыста і адваката хаця і... не украінцаў..

А ў нас завуць на „канфэрэнцыю“ „прафэсара“ Косьцевіча, „дохтара“ Паўлюкевіча, ці ўжо — зусім „ніякага“ Шышкова...

Амэрыканская дапамога. Як ведама, беларускія культурныя ўстановы, пазбаўленыя ўсякае дапамогі з боку Польскае дзяржавы, істнуюць выключна коштам самога беларускага грамадзянства. Значнае месца займае ў гэтым дапамога нашых эмігрантаў у Амэрыцы.

Вось-жа ў апошнія часы амэрыканская прэса вельмі зацікавілася палажэньнем беларусаў пад уладай Польшчы, а вынікам гэтага зьяўляецца спогад нашай бядзе з боку запраўдных амэрыканцаў. Так, нейкі амэрыканец Сьміс ахвяраваў гэтымі днямі 100 даляраў на беларускі інтэрнат у Радашкавічах. Ёсьць надзея, што за ім пойдуць і другія.

Гэтая першая дапамога з вольнай амэрыканскай зямлі—ад чалавека, зусім чужога нашаму народу, мае перад усім вялікае маральнае значэньне: яна паказуе, з якой пашанай адносіцца Амэрыка да імкненьня беларускага народу тварыць сваімі рукамі сваю ўласную нацыянальную культуру.

„Грозная пэрспэктыва“. „Słowo“ паведамляе, што крэдыты на куплю насеньня ў Віленска-Троцкім павеце—гэткія малыя, што ўся сума крэдытаў на павет магла-бы здаволіць, як сьлед, усяго толькі **адну гміну**.

У сувязі з гэтым стан сёлетніх пасеваў будзе вельмі благі і пагражае паважнай небясьпекай для ўраджаю.

А падаткі ж не зьмяншаюцца, а хіба яшчэ больш павялічваюцца....

Новая Беларуская часопісь. 1 лютага начала выхадзіць у Варшаве новая беларуская часопісь „Праваслаўны Беларус“, пасьвячоная справам Праваслаўнай Царквы ў Заходняй Беларусі.

„Студэнцкая Думка“. Выйшаў з друку № 2 органу беларускае Студэнцкае моладзі ў Вільні.

„Авадзень“. Выйшаў № 2 (агульным лікам—3) „дватыднёвіка сатыры, жартаў і сьмеху“ пад назовам „Авадзень“, выданы гэтым разам літаграфскім спосабам. Ілюстрацыі ад гэтага пераходу выйгралі, але тэкст ня зусім чысты, на што Рэдакцыя павінна зьвярнуць больш увагі.

Урад Белар. Навук. Т-ва. шчыра дзякуе гр. Кобаку, з Юрацішак, за ахвяраваныя музэю імені Ів. Луцкевіча старыя дакумэнты і друкі.

Адначасна Урад дзякуе грам. Юрыю Верашчацы за кнігу „Conflit polono-lithuanien. Question de Vilna, 1918—24 г.“, якая была пераслана праз студэнта Янку Станкевіча.

З вайсковага жыцьця. Колькі дзён назад у Сьвянцянскім павеце зваліўся з маста ў раку і ўтануў капрал бранявога цягніка Баульц-Вашковскі. Як даведалася „Słowo“, вайсковая ўлада, правёўшы сьледзтва, заарыштавала жаўнера Стафана Юдыслава, западозранага ў тым, што ён зумысьля скінуў капрала ў раку.

Карэспандэнцыі.

„Палітычны агент“.

(*Маладэчна*).

У м. Маладэчне жыве нейкі пан Юзюкоўскі, паходжаньне і мінуўшчына якога добра невядомы, як невядома таксама, з чаго ён жыве.

Нядаўна гэты п. Юзюкоўскі, з тоўстым партфэлем пад пахай і выдаючы сябе за палітычнага агента сыскнога аддзелу, пачаў аб'яжджаць каля Маладэчна вёскі, зьбіраючы ад лёгка верных і баязьлівых людзей „орiпjі“. За добрую „орiпjі“ бралася ад 4 злот. і ўгару, сколькі было можна, аж пакуль яго не адвялі ў паліцыю. Перш Юзюкоўскі тым-жа самым прыблізна займаўся і ў Маладэчне, бо „ведаў“ аб кім і калі будзе напісана благая „орiпja“, — пісаў людзям просьбы ў розныя ўстановы і як за тое, так і за другое браў грошы.

Але Юзюкоўскі ізноў у Маладэчне, і людзі чакаюць ад яго чагось... можа, яшчэ лепшага! **А. Г.**

Інспэктар ня відзіць?!..

(*Маладэчна*).

Падрадчык Бэрнацкі, які будуе вайсковыя казармы ў Галянове, надта не акуратна разрахоўваецца з людзьмі, якія ў яго працуюць. Калі хто з іх адважыцца дамагацца заробленых грошы, таго страшаць паліцыяй (?!).

Але гэтага пан інспэктар працы „ня відзіць“, а мо' яму... некалі? **Вясковы.**

Шукаюць.

(З *Вялейшчыны*).

Нядаўна, а гадзіне 10-ай ўпачы, памоцнік каманданта Маладэчанскага пастарунку з паліцыянтамі зьявіўся да жыхара вёскі Вялікае Сяло, Бандара Яна, рабіць вобыск. Чаго шукалі, — невядома. Хату ўсю перавярнулі дагары нагамі і хацелі нават узьдзіраць падлогу, але „адумаліся“. Замест гэтага загадалі гаспадару лезьці пад печ і сталі дапытавацца, што там ёсьць схавана. Гаспадар адказаў жартуючы, што пэўна гармата і кулямёт, за што чуць не дастаў ад аднаго з паліцыянтаў (а яны былі „ў вясёлым гумары“) па твару. Але і пад печчу нічагусенькі не знайшлі. Сялян аблаялі камуністамі і, набраўшы ў нешчасьлівага гаспадара бялізны, выйшлі. Назаўтрае, аднак, бялізну зьвярнулі, бо... яе ня варта было і браць.

Вясковы.

Па канстытуцыі і па закону.

(*Вёска Хаўля, гм. Гарадоцкай, Вялейскага пав.*).

Два гады назад сюды прыехаў у шапцы ўрадоўца польскі вучыцель і прыказаў пасылаць дзяцей у „школу“. Запалоханыя штрафам і арыштам бацькі, хоць і неахвотна, а дзяцей паслалі. У гэтай школе дзеці толькі калечыліся, бо вучыцель, відаць, нікол і ня „сьніў“ што патрафе быць вучыцялем.

У сёлетнім школьным годзе сяляне, апіраючыся на закон аб школах і мове ў урадах, пачалі дамагацца беларускай школы і дзяцей у старую школу не паслалі. Школы беларускай ім не далі, а вучыцель—урадовец паштрафаваў „упартых“ бацькоў ад 15 да 40 злот.: хто разьбітнейшы, таго болі. Баючыся яшчэ большага штрафу і арыштаў, якія ім сулілі, бацькі ізноў папхнулі сваіх дзяцей у гэную „школу“.

Насяленьне гэтай і акалічных вёсак выключна беларускае. **Вясковец.**

За што?

(*Вёска Бакшты, Вялейскага пав.*).

У студзені прошлага году аддзелам коннай паліцыі, які стаіць у вёсцы Караблёх, быў праведзены праз вёску Бакшты да Гарадка тэлефон. Аднаго разу гэты дрот парваўся. Паліцыянт, які заўважыў, што дрот ляжыць на зямлі, пазваў балей паліцыянтаў і ўначы прыехалі ў Бакшты, дзе перш за ўсё адабілі грамадзяніна Жохаўца, які пад той час стаяў на варце, каб ён сказаў, хто рэзаў дрот. Хлапец са страху сказаў на двух грамадзян, у якіх зараз-жа быў зроблены старанна вобыск. Але не знайшлі ані цэнтымэтру дроту, нават старога, якога так многа валяецца пасьля нямецкай вайны.

Варта была забрана ў Караблі, гдзе вартаўнікоў ізноў некалькі разоў абабілі. А назаўтрае ўвечары, нацягаваючы дрот, паліцыянты пераканаліся, што дроту ніхто ня рэзаў, а ён сам разьвязаўся (відаць, умела быў зьвязаны?!). Вартаўнікоў звольнілі, але што паабівалі, тое засталося на карку. **Недалёкі.**

„Недаразуменьне“.

(З *Вілейшчыны*).

17 сьнежня 1924 г. ў хату селяніна засьценку Агароднікі, Гарадоцкае гм., Вялейскага пав., Ігнася Барадзіча зьявіўся ў асысьце паліцыянта ўрадовец Вялейскага Urzędu Skarbowego, п. Сенькевіч і запатрабаваў ад яго жонкі (бо сам гаспадар быў у гэты час у млыне) заплаты падатку, які яшчэ 11 сьнежня быў праз Р. К. О. заплачаны. Не даючы нават кабеце часу даказаць аплату гэтага падатку квітом (квіт быў у суседа, з каторым яны разам аплачаваюць падаткі), ён забраў вісеўшы на сьцяне кажух з рукавіцамі ў кішані на аплату гэтага падатку. Аб гэтым бяспраўным „забіраньні“ даўно ўжо заплачанага падатку Барадзіч зараз-жа заявіў паліцыі. Камандант сьпісаць аб гэтым пратакол адмовіўся, а сказаў, каб Барадзіч назаўтра прыйшоў на пастарунак па кажух. Бедны селянін кожны дзень, пачынаючы ад 17, хадзіў па свой кажух на пастарунак і кожны раз яго бачыў, як сваё вуха. Наастатку 21 сьнежня яму ўдалося злавіць самога „пана“ Сенькевіча ў воласьці, гдзе ён прымаў падаткі.

Даведаўшыся, што Барадзіч прыйшоў па кажух, урадовец павёў яго на пастарунак, гдзе пачалі селяніна страшыць за абразу ўрадоўца і сьпісалі пратакол, падпісаць які ён адмовіўся, бо яго яму не прачыталі. На просьбу аддаць кажух, Сенькевіч адказаў, што верне яго толькі тады, калі будзе заплачана 2 злот. кары. Але селянін, які падатак заплаціў у свой час, гэту кару плаціць таксама адмовіўся, хоць і кажуха ў гэты дзень не атрымаў. Але затое назаўтрае ўрадовец Сенькевіч, мусіць, пераканаўся, што з Барадзіча „сьцягнуць“ нічога ня ўдасца, кажух яго яму вярнуў, дакляроўваючы, што кажух гэты будзе яму дорага каштаваць.

Кажух то вярнуўся, помніць абяцалі, але рукавіцы і пяць праходжаных напрасна дзён і сягоньня там. **Гаротнік.**

Вызваленец — „абаронца“.

(З *Валожыншчыны*).

У пачатку сьнежня 1924 г. камандант пастарунку паліцыі ў Палачанах „заарыштаваў“ 13 гадавога хлапца, сына селяніна Кісьліцкага, быццам затое, што той ударыў грудкай якуюсь жанчыну (кажуць, што жонку каманданта).

На пастарунку пачалася з хлапцом расправа: матку, якая з ім разам прышла ў паліцыю, адправілі дамоў, а хлапца дагала разьдзелі, палажылі на зямлю і пачалі біць. Білі, пакуль ім хацелася, а пасьля пратрымалі на пастарунку да вечара, ды вечарам выпусьцілі.

Бацькі гэтага хлапца, хочучы ўсю справу скіраваць у суд, завязьлі яго ў Валожын к павятоваму доктару, які, агледзіўшы хлапца, знайшоў усе сьляды біцьця і выдаў адпаведнае пасьведчаньне. Напісалі скаргу і хацелі яе падаць у адпаведную ўстанову.

Але пад той час падвярнуўся якраз ім пасол у Сойм з „Вызваленя“ — Галавач. Напрасіўшыся за „адваката“, ён усю гэтую справу забраў з сабой у „Сойм“, і яна, ведама, і сягоньня там, бо вызваленцы аб нас надта „рупяцца“. **Палачанскі.**

Напад на пастарунак.

(З *Косаўшчыны*).

27 сьнежня с. г. каля вёскі Пескі, тэй-жа гміны, невядомыя бандыты забілі каманданта пастарунку на разьезьдзе „Бронна гура“ і аднаго паліцыянта, а аднаго паліцыянта равілі. Бандыты скрыліся. **І. К.**

Па XII тому законаў расейскіх.

(*з Жыдамлянскай гм.*).

19—20 гэтага месяца зьявіліся нейкія „камуністычныя лістоўкі“, аб якіх адзін тамашні хлапец, які быў троху падвыпіўшы, „прагаварыўся“ перад папом з в. Галавачы, Скідальскай гміны. Поп аб гэтым данёс у „крыміналку“, і цяпер беднага хлапца што дня „бадае“ паліцыя. **Пранырa.**

Каменная воспа.

(*з Слонімшчыны*).

Сын аднаго з „porządnych gospodarzy“ з вёскі Пруды, Павал Баранскі, чалавек „ня просты“, узяўся „асьвятляць“ дзетак нашага краю і... зрабіўся польскім вучыцелем. Але трудненька яму асьвятляць іх, калі сам ён пайшоў у вучыцялі з адукацыяй пачатковай школы. У 1920 і 1921 годзе ён быў вучыцелем у м-ку Казлоўшчына, таго-ж павету, гдзе адракамандаваўся панам „nauczycielem“ з пад Варшавы. Сёлета гэты „nauczyciel“ „працуе“ ў вёсцы Вострава, ля Слоніма, гдзе, выконаваючы „сумлена“ свае абавязкі, паштрафаваў бацькоў сваіх вучняў, дый увечары разам з солтысам пайшоў гэты штраф спаганяць. Калі „зборшчыкі“ выхадзілі а якойсьці нешчасьлівай хаты, хтось выбіў гэтаму „вучыцелю“ каменем вока. Небарака праляжаў у бальніцы два месяцы. Бацькі тлумачылі, што на тое сяло, гдзе іх сын вучыцелем, напала воспа, а разам і на іх сына. Але пан „nauczyciel“ з пад Варшавы, госьцячы ў бацькоў на каляды, сумленна прызнаўся, што якісьці „złoczyńca“ яму гэта вока выбіў.

Сьвятам сазваў гэты п. „nauczyciel“ да сябе гасьцей, падчас банкету добра напіўся, аблаяў прысутных, а пасьля нават пачаў у іх страляць.

Госьці большага не... чакалі і ўцяклі.

Тутэйшы.

Вясельны падатак.

(З *Слонімшчыны*).

Увосені 1924 г. жаніўся пісар аднэй з гмін Слонімскага павету, якісьці пан Грывкевіч, які надта хутка багацее (як Вітас?). Перад вясельлем зьявіўся ў гміне загад, каб вясковыя солтысы к „урачыстаму“ дню чагось-небудзь „даставілі“. Юцэйскаму солтысу Аляксандру Лабуцю загадана было прынясьці 2 капы яек і 5 ф. масла. Але Лабуць гэтага споўніць ня мог, бо вёска Юцэвічы купляе зямлю, дык амаль, што ня ўсю скаціну сяляне папрадавалі, а масла і яйкі, калі іх хто мёў, пайшлі на пазямельныя падаткі.

Разгневаны пісар і войт запатрабавалі ад беднага солтыса другі раз падатку ад коні і ў дадатак аддалі на пастарунак „за непаслушнасьць“. Солтыс знайшоў квіт аб заплаце падатку за коні (ў ліку 40 міліёнаў), і паліцыя яго мусіла выпусьціць. Але што будзе далей?..

Тутэйшы.

Усячына.

Разводы ў Варшаве.

Варшаўскі адвакат і пасол Бічнэр у публічным дакладзе ў Варшаве сцьвярдзіў, што за 1924 год у аднэй толькі Варшаве было сярод палякоў 28.000 разводаў. І гэта — ня гледзячы на тое, што каталіцкі Касьцёл не прызнае разводу!

Амэрыканскія багатыры.

Дэпартамант Фінансаў у сваей справаздачы публікуе, паміж іншым, што ў Амэрыцы асоб, маючых больш 1 міліёну даляраў даходу ў год, у 1922 г. было 15, а ў 1923—ужо 67; асоб, маючых у год больш 5 міліёнаў, ёсьць толькі 4: Рокфэльлер, абодва Форды (бацька і сын), і Дыэз.

Паштовая скрынка.

Грамадзяніну вёскі Бароўкі. Карэспандэнцыя атрымана, пішыце аб паважных справах.

Маладому — у Маладэчне. Аб сварцы афіцэраў атрымалі, але дзеля „незалежных“ прычын ня друкуем.

Папрыка—у Празе. Ваш верш аддалі ў „Студэнцкую Думку“.

Ал. Галынцу. Стацьцю Вашую, як неадпаведную для нашае газэты, мы аддалі ў рэд. „Студэнцкае Думкі“.

М. Поўначы, Б. Локуцэвічу, М. Войнічу, М. Дікерту, Я. Ніцыеўскаму, М. Юрынку.—Вашыя лісты атрымалі. Просьбу споўняем, веручы ў Вашую добрую волю.

П. Сеўруку. Адкажам лістоўна.

Атрымана:

Ад А. Капуцкага, кс. Я. Голуба, Тодара Капусты, Паўла Ахрамовіча, Антона Грыкі, Вінц. Сідорчыка, Сьцяпана Пятруля, Лабоцкага, Пятра Драніцы, Андрэя Пугача, Юльяна Зеленкевіча, Міхаліны Скінкоўскай, Ан. Касовеца, Міхала Калюты, Мікалая Лебядзінскага, Клім. Парфянюка, Рамана Бечаньскага, Язэпа Дабжаньскага, Сымона Сяляўкі, Рыгора Зіновіча, Мікіты Драткоўскага, С. М. Пагуды, Тодара Сапегі, Базыля Мацко, Уладзімера Крэня, Антона Касатага, Мікалая Парфенчыка, Васіля Кароля, Алесі Каньчук, Базыля Сенькевіча, Міхала Карпейчыка, Антавільскага, Міхала Русіна—**па 2 злоты.**

Ад Ігната Скабеека, Уладзімера Мятлы, Піліпа Аксяневіча, Савеля Васілевіча, Сьцяпана Кевлі, В. Кузьміча, Я. Кучука, Паўла Курпіка, Яна Коніка, Уладзімера Буцькі—**па 4 злоты.**

Ад Трафіма Сакаловіча, Сьцяпана Шчыглінскага, Яна Латыша, Аляксандра Вільчыцкага. Д. Суботко—**па 5 злоты.**

Ад Аляксандра Патаповіча, Антона Кандратовіча, Паўла Борыса, Франц. Янкоўскага, Франц. Калодзея—**па 6 злоты.**

Ад М. Бурсэвіча, Язэпа Ширковеца, і Марка Ходзькі—**па 10 злоты.**

Ад А. Махноўскай і А. Салаўёвай—па 100 латвійскіх руб., г. зн. па 1 зл. 80 гр.

Ад Пятра Волка—1 зл. 50 гр., Ігната Дзяменіка—3 зл. 50 гр., Яна Трахімовіча—6 зл. 40 гр., Кан. Сьвятагора—1 зл., Ігната Барысёнка — 3 зл., Уладзімера Каляды—2 зл. 30 гр.

Рэдактар-Выдавец Антон Пракапеня.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.